**Кулакоў, Ф.** Прызваныя на службу, яны выконвалі загад… / Ф. Кулакоў // Дняпроўская праўда. – 2009. – 14 лют. – С. 2.

**ПРЫЗВАНЫЯ НА СЛУЖБУ, ЯНЫ ВЫКОНВАЛІ ЗАГАД…**



***Леанід Мінкевіч (на здымку) нарадзіўся ў 1962 годзе ў вёсцы Холаўе. Скончыў СШ № 1 горада Дуброўна, стаў аграномам, працаваць пачынаў у родным калгасе «Прагрэс». Вясной 1981 года быў прызваны на службу ў Савецкую Армію. Тры месяцы асвойваў спецыяльнасць радыётэлефаніста ў горадзе Тэрмез, затым на верталёце быў перакінуты ў Афганістан. Прымаў удзел у баявых дзеяннях, за што ўзнагароджаны медалём «За адвагу».***

***Пасля звальнення ў запас працаваў у Дубровенскім райкаме камсамола, затым – у органах Міністэрства ўнутраных спраў, цяпер працуе ў райваенкамаце. Не так даўно абраны старшынёй раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». З ім гутарыць карэспандэнт «Дняпроўскай праўды».***

**– Леанід Уладзіміравіч, з часоў вашай службы ў Афганістане мінула каля трох дзесяткаў гадоў. Як цяпер глядзіце вы на ўдзел савецкіх войск у той афганскай вайне?**

– Я не стратэг і не палітык, каб даваць шырокамаштабныя ацэнкі. Тады для нас было зразумела: ёсць загад, які ваенны чалавек абавязаны выконваць. Прыкладна так гляджу я на ўсё, што адбывалася, і цяпер.

Але мяне, як і ўсіх маіх суайчыннікаў, ніяк не суцяшае тое, што ў ДРА служылі 28832 беларусы: 723 чалавекі загінулі, 12 – прапалі без вестак, 718 – сталі інвалідамі.

Гэта была суровая і вельмі небяспечная служба. Але савецкія воіны, у прыватнасці, дубровенцы, з гонарам выконвалі заданне Радзімы. Многія вярнуліся дамоў з баявымі ўзнагародамі.

**– У спісе, які друкуецца на 3-й старонцы ў сённяшнім нумары газеты, не было графы «ўзнагароды». Яе ўвялі мы тут, прама ў рэдакцыі. І вы, Леанід Уладзіміравіч, па памяці назвалі ўсіх узнагароджаных і практычна ўсе ўзнагароды, удакладніўшы па тэлефоне толькі некалькі з іх. Гэта гаворыць аб тым, што вы добра ведаеце сваіх баявых таварышаў, падтрымліваеце з імі сувязі.**

– Я ведаў іх, калі працаваў загадчыкам арганізацыйнага аддзела райкама камсамола. Тады мы ўсе былі маладыя і нам было цікава сустракацца, ведаць, як у каго склаўся пасляваенны лес. А складваўся, калі меркаваць хоць бы па друкуемых тут спісах, у кожнага па-свойму – у каго шчасліва, у каго трагічна.

Потым нашу маладую ветэранскую арганізацыю доўгі час узначальваў М. У. Махначоў. Цяпер – зноў я, а Мікалай Уладзіміравіч працуе настаўнікам у Зарубскім дзетсадзе-школе, карыстаецца ў калектыве заслужаным аўтарытэтам. Такія словы, характарызуючыя чалавека, я мог бы сказаць амаль пра ўсіх сваіх таварышаў.

**– Ці можа аказваць ваша арганізацыя якую-небудзь матэрыяльную падтрымку сваім членам?**

– У нечым мы прыроўнены да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць у нас і свая льгота. Кожны воін-афганец па двухтыднёвай пуцёўцы можа прайсці бясплатны курс лячэння і адпачыць у Віцебскім абласным цэнтры рэабілітацыі для воінаў-афганцаў. Можна паехаць туды з жонкай ці ўсёй сям'ёй, але ўжо з даплатай, можна адправіць кагосьці з членаў сям'і. Так, воін-афганец Сяргей Міхайлавіч Пузыроў з Лядоў узяў пуцёўку для лячэння жонкі. Адмовы ад выдзялення пуцёўкі не бывае. У цэнтры рэабілітацыі устаноулена найноўшая медыцынская апаратура, там працуюць выдатныя спецыялісты, а таму і лячэнне добрае.

**– Як удзельнічае ваша арганізацыя ў грамадскім жыцці раёна? Ці не адчуваеце вы сябе неяк абдзеленымі ўвагай?**

– Прыпамінаю часы, калі ў некаторых установах на воінаў-інтэрнацыяналістаў маглі паглядзець звысоку, маўляў, мы вас туды не пасылалі. Мы не маглі расказваць праўду аб вайне. І некаторым начальнікам-бюракратам здавалася, што служба ў Афганістане была ледзь ці не прагулкай, хоць адтуль і прыходзілі «чорныя цюльпаны» – самалёты з загінуўшымі воінамі.

Потым раскрылася поўнасцю праўда аб гэтай вайне, аб гераізме нашых салдат і камандзіраў, і да воінаў-інтэрнацыяналістаў сталі адносіцца так, як яны таго заслужылі.

Мы ўзаемадзейнічаем з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, з больш шматлікай Аршанскай аб´яднанай (горад і раён) арганізацыяй «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Нас запрашаюць у школы, такія запрашэнні ахвотна прымаюць Мікалай Махначоў, Ігар Аляшкевіч, Сяргей Пузыроў, Мікалай Курпатаў, Сяргей Шаргаёў і іншыя. Не адмаўляюся і я.

13 лютага 2009 года быў праведзены ўрачысты сход з канцэртам, арганізаваць гэта мерапрыемства нам дапамагаў аддзел ідэалагічнай работы райвыканкама. У ЦдіЮТ плануем правесці сустрэчу воінаў-афганцаў з іх маці і членамі сем´яў. Замыкацца ў сваім вузкім коле ці жыць кожны сам па сабе не збіраемся.

**Фёдар Кулакоў**